ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 234 (1201) | СЕРАДА, 8-га кастрычніка 1930 г.

Організаваць шырокую справаздачнасьць колгасаў перад масамі адзіналічнікаў

Дзень ўраджаю і колектывізацыі забясьпечыць масавы прыліў бядняцка-серадняцкіх адзіналічных гаспадарак у колгасы і організацыю новых колгасаў

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб правядзеньні дню ўраджаю і колектывізацыі

1. Ураджай 1930 году, які перавысіў любы ўраджай за мінулыя гады, дасягнуты дзякуючы правільнай політыцы партыі, якая забясьпечыла вялізарны рост саўгасаў і колгасаў, укараненьне трактароў у сельскую гаспадарку, шырокае разгортваньне аграмерапрыемстваў і далейшае ўцягваньне новых мільёнаў беднякоў і серадняков у барацьбу за суцэльную колектывізацыю і, на гэтай аснове, ліквідацыю кулацтва як клясы.

2. Шлях колектывізацыі і ўраджаю сёлета неабходна правесьці пад знакам шырокага ўцягненьня новых мільёнаў бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак у колгасы, пераходу прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў (ТОЗ, пасёлкавае таварыства) у арцелі, а таксама ўсямернага і прытым сапраўднага ўмацаваньня існуючых колгасаў шляхам масавага агляду і шырокай популярызацыі дасягненьняў колгасаў, саўгасаў і машынна-трактарных станцый і асьвятленьня перад масамі задач барацьбы супроць фактаў недысцыпліна ванасьці, расхлябанасьці і іншых, якія маюцца ў колгасах і саўгасах. Задачы колгаснага будаўніцтва і яго дасягненьні павінны быць паказаны і растлумачаны шырокім масам беднякоў і серадняков адзіналічнікаў, якія яшчэ не ўвайшлі ў колгасы, з тым, каб з гэтых дасягненьнях яны ясна ўбачылі ўсю перавагу колектыўнае гаспадаркі.

3. З гэтай мэтай організаваць справаздачныя сходы ўсіх колгасьнікаў аб выніках году, з шырокім прыцягненьнем на гэтыя сходы беднякоў і серадняков адзіналічнікаў; даклады колгасаў аб выніках году на сельскіх сходах беднякоў і серадняков як сваіх, так і суседніх вёсак; выстаўкі дасягненьняў колгасаў і г. д. Адначасова „дзень колектывізацыі і ўраджаю“ неабходна скарыстаць для ўсямернага ўмацненьня сувязі гарадзкіх рабочых і работніц з колгасьнікамі і бядняцка-серадняцкімі масамі ў самых рознастайных формах (сумесныя вытворчыя конфэрэнцыі прадпрыемстваў, саўгасаў і колгасаў, праверка дагавораў на шэфства і заключэньне новых, пасылка пролетарскіх дэлегацый у саўгасы і колгасы і колгасных— на прадпрыемствы і іншае). Разам з тым павінна быць падхоплена ініцыятыва сельска-гаспадарчых рабочых, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас у складаньні бугнога пляну сельска-гаспадарчае вытворчасьці і мобілізацыі самадзейнасьці колгасьнікаў шляхам соцспаборніцтва і ўдарніцтва для барацьбы з скажэньнямі і недахопамі колгаснага будаўніцтва.

4. Зрабіць праверку выкананьня колгасамі і адзіналічнікамі хлебазагатоўчага пляну і мобілізаваць колгасьнікаў і адзіналічнікаў, беднякоў і серадняков на хутчэйшае выкананьне хлебазагатовак і палепшаньне забясьпечаньня пролетарскіх раёнаў, на выкананьне ў тэрмін уборкі, малацьбы і зяблевай узоркі. Пры гэтым асаблівая ўвага павінна быць удзелена мобілізацыі актыўнасьці колгасьніц, бядняцка-серадняцкіх мас сялянак. Дэлегацкія сходы, жаночыя клюбы, чырвоныя гурты, масавыя конфэрэнцыі сялянак павінны стаць ініцыятарамі і організатарамі чырвоных абозаў, ударных брыгад па выкананьню хлебазагатоўчага пляну, кантрактацыі буракоў, ільну, забясьпечаньня рабочых раёнаў гароднінай, малаком, а таксама застрэльшчыкамі організацыі новых колгасаў і вытворча-кооперацыйных аб'яднаньняў.

5. ЦК прапануе ўсім партыйным, профсаюзным, комсамольскім колгасна-кооперацыйным і савецкім організацыям забясьпечыць сапраўды масавы характар „дня колектывізацыі і ўраджаю“, акуратна падрыхтаваць мерапрыемствы, якія неабходна правесьці для ўзмацненьня колгасаў і ўцягненьня новых мільёнаў беднякоў і серадняков у колгасы, рашуча змагаючыся з правай і „левай“ опортуністычнай практыкай у колгасным будаўніцтве, супроць стаўкі на самацёк, замыканьня колгасаў, недаацэнкі актыўнасьці кулака, паслабленьня адпору контррэволюцыйнай шкодніцкай рабоце кулацтва, а таксама супроць усякіх праяўленьняў камандваньня і антысерадняцкіх скажэньняў у справе разгортваньня колгаснага будаўніцтва. „Дзень колектывізацыі і ўраджаю“ правесьці з 15 па 25 кастрычніка.

Рэволюцыйную хвалю—ня стрымаць!

Конфэрэнцыя маладых ударнікаў Фрунзэўскага раёну рашуча протэстуе супроць крывавых дзеяньняў польскага фашызму

Учора конфэрэнцыя ўдарнікаў Фрунзэўскага раёну заслухала інфармацыю аб крывавых падзеях у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі.

Конфэрэнцыя вынесла рашучы протэст супроць крывавых дзеяньняў польскіх жандараў, якія імкнуцца ў крыві патапіць рэволюцыйны рух.

У аднагалосна прынятай рэзолюцыі конфэрэнцыя запэўніла партыю, комсамол і працоўных Заходняй Украіны і Зах. Беларусі ў тым, што па-першаму заклiку комуністычнай партыі і савецкай улады рабочая моладзь Фрунзаўкі дасьць рашучы адпор тым, хто спрабуе напасьці на фарпост сусьветнай пролетарскай рэволюцыі— Савецкі Саюз.

Яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам будзем весьці барацьбу за бальшавіцкія тэмпы ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі ў 4 гады, за будаўніцтва соцыялізму.

Усе як адзін у шэрагі ўдарнікаў!

Няхай жыве компартыя і комсамол Заходняй Украіны і Зах. Беларусі!

Няхай жыве штаб сусьветнай рэволюцыі—Комінтэрн!

Пакончыць з манэўраваньнем правых

Двурушнікам, здраднікам ня месца ў шэрагах нашай партыі

Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) аб М. Руціне

За здрадніцка-двурушніцкія паводзіны ў адносінах партыі і за спробы да падпольнай пропаганды праваопортуністычных поглядаў, прызнаных XVI зьездам несумяшчальнымі са знаходжаньнем у партыі, выключыць М. Руціна з радоў УсеКП(б).

Прэзыдыум ЦКК.

Правых опортуністых, здраднікаў партыі,—вон з нашых радоў

Пастановай ЦКК УсеКП(б) выключан з партыі Руцін. Выключаны з партыі Руцін прадстаўляе сабой лепшы ўзор двурушніка. Будучы сэкратаром Краснапрэсьненскага райкому, Руцін разам з т. Угланым і іншымі вёў фракцыйнае змаганьне супроць ЦК. Ён разам з усёй правай опозыцыяй прабаваў супроцьставіць партыі і ЦК маскоўскую організацыю. Руцін разам з т.т. Угланавым і Бухарыным абвінавачваў партыю ў скочваньні да трацкізму. Руцін, разам з усімі правымі, змагаўся супроць будаўніцтва колгасаў і саўгасаў. Яны абвяшчалі трацкізмам організаванае партыяй соцыялістычнае наступленьне на кулацтва. Ленінская маскоўская організацыя зьняла сваё былое праваопортуністычнае кіраўніцтва. Партыя асудзіла погляды правых. Некаторыя таварышы, якія абаранялі гэтыя погляды, пад уплывам партыйнай крытыкі, шчыра адмовіліся ад іх, пачалі прымаць актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве. Але, як цяпер стала відавочна, Руцін не належаў да іх ліку. Некалькі год знаходжаньня яго ў бальшавіцкай партыі не зрабілі з гэтага былога меншавіка бальшавіком. Але з адкрытай пропаведзяй праваопортуністычных поглядаў стала трудна зьяўляцца ў партыйных організацыях. Таму Руцін, як і некаторыя іншыя правыя, яшчэ ў кастрычніку 1928 году пачаў манэўраваць.

Прызнаўшы на кастрычніцкім пленуме МК у 1928 г. свае памылкі, ён застаўся паранейшаму правым опортуністым. Праўда, ён і пасьля галасаваў, выступаў і пісаў у абарону генэральнай лініі. Але гэта быў адзін бок дзейнасьці Руціна. Быў яшчэ другі бок, захаваны ад партыі. Тут быў і дзейнічаў сапраўдны Руцін, правы опортуністы і здраднік партыі. Так, Руцін здраджваў партыі. А сьпіной партыі, карыстаючыся яе давер'ем, ён прабаваў скарыстаць труднасьці соцыялістычнага будаўніцтва для разлажэньня партыйцаў. Ён каціўся ўсё ніжэй і ніжэй. Руцін ня толькі, як у свой час зьменавехаўцы, і як гэта робіць цяпер многія правыя, чакаў, што партыя адмовіцца ад політыкі разгорнутага соцыялістычнага наступленьня, але ён прабаваў весьці падпольную работу супроць ЦК, як сапраўдны кулацкі агент, як нагадвае Громана і Суханава. Руцін, які ў свой час адважваўся абвінавачваць партыю ў трацкізьме, пропагандаваў цяпер блёк правых з трацкістымі. Няма нічога супрацьнатуральнага ў шлюбе трацкістых з правымі. Гэта—адна поля ягадкі. Троцкі прымае праваопортуністычную плятформу па цэлым радзе асноўных пытаньняў. З другога боку, правыя робяць той-жа шлях да трацкізму, які ў свой час быў праробдены Зіноўевым і Каменевым. Руціны цяпер крычаць, што ў сваёй крытыцы партыі і яе бальшавіцкага ленінскага „рэжыму“ меў рацыю меншавік Троцкі. Опортуністыя ўсіх колераў выконваюць соцыяльны заказ кулакоў, шкоднікаў і буржуазіі: падрываць сталёвы хрыбет пролетарскай дыктатуры УсеКП(б). У імя змаганьня супроць партыі і яе ленінскага кіраўніцтва, Руціны—правыя опортуністыя—працягваюць руку да контррэволюцыйнага меншавіцкага трацкізму.

Руцін выкрыты і выкінуты з радоў партыі, як здраднік і двурушнік. Аднак, няма ніякіх падстаў думаць, што Руцін зьяўляецца выключэньнем. Наадварот, цэлы рад фактаў, ужо паданых у друку, зазначаюць, што XVI зьезд партыі зусім правільна і сваечасова папярэджваў партыю аб новым манэўры опортуністых усіх колераў, аб іх двурушніцтве. Зьезд у сваёй рэзолюцыі па дакладу ЦК зьвярнуў... „увагу ўсёй партыі на тое, што опортуністыя ўсіх колераў, а асабліва правыя, ужываюць новы манэўр, які выяўляецца ў фармальным прызнаньні сваіх памылак і фармальнай згодзе з генэральнай лініяй партыі, не пацьвярджаючы сваё прызнаньне работай і змаганьнем за генэральную лінію, што на справе азначае толькі пераход ад адкрытага змаганьня супроць партыі да скрытага, або да чаканьня больш зручнага моманту для аднаўленьня атакі на партыю“.

Пасьля зьезду, у сувязі з яго пастановай аб несумяшчальнасьці поглядаў правай опозыцыі з прыналежнасьцю да УсеКП(б), опортуністыя нямінуча пачалі яшчэ шырэй праяўляць двурушніцтва і ашукваць партыю. Яны згодны на словах колькі хочаш прызнаваць свае памылкі і ў той-жа час вядуць сваю антыпартыйную, па сутнасьці контррэволюцыйную, справу змаганьня супроць партыі, супроць разгорнутага соцыялістычнага наступленьня, за капіталістычную рэстаўрацыю. Справа Руціна яшчэ і яшчэ раз заклікае ўсю партыю да пільнасьці, да мобілізацыі сіл ня толькі супроць адкрытага, але і супроць скрытага опортунізму і двурушніцтва.

Партыйныя організацыі абавязаны выканаць пастанову XVI зьезду і бязьлітасна выганяць з сваіх радоў правых опортуністых, саюзьнікаў трацкістых, у тым ліку і тых, хто з іх прыкрываецца згодай з генэральнай лініяй партыі і пад гэтым прыкрыцьцем вядзе здрадніцкую работу ў нашых радох нецярпімы здраднікі партыі!

(„Праўда“).

Чарговы нумар „Чырвонай Зьмены“ выйдзе 10-га кастрычніка.

Польшча

Комдэпутат тав. Жарскі прыгаворан да 16 год катаргі

„Я ўвайшоў у сойм,—заявіў Жарскі, — ва ўмовах надзвычайна складанай політычнай абстаноўкі і з першага дня разам з усёй комуністычнай фракцыяй пачаў рашучую барацьбу супроць ілюзіі быццам-бы ППС вядзе барацьбу супроць фашысцкага ўраду. Мы паказвалі масам, што фашысцкі ўрад будзе нізрынуты толькі ўзброеным паўстаньнем мас“.

ВАРШАВА, 6. Сёньня аднавілася слуханьнем справа Райха і Жарскага, якім прад'яўлена абвінавачаньне ў тым, што яны зьяўляюцца членамі ЦК комуністычнае партыі Польшчы.

Перад сканчэньнем судовага сьледзтва было прадастаўлена слова для заявы былому дэпутату, члену комуністычнае фракцыі Жарскаму.

Абвінавачаны падкрэсьліў, што ён зьяўляецца комуністым і на працягу ўсёй сваёй работы ў Польшчы, да выбараў у сойм і ў самым сойме ў якасьці дэпутата, сваіх поглядаў ня скрываў.

— Я ўвайшоў у сойм,—заявіў т. Жарскі,—ва ўмовах надзвычайна складанай політычнай абстаноўкі і з першага-ж дня, разам з усёй комуністычнай фракцыяй, пачаў рашучую барацьбу супроць ілюзій, быццам ППС вядзе барацьбу супроць фашысцкага ўраду.

Старшыня суда перарывае Жарскага, які працягвае: „Мы паказвалі масам, што фашысцкі ўрад будзе нізрынут толькі ўзброеным паўстаньнем мас“.

Паміж Жарскім і старшынёй суда адбываецца наступны дыялёг.

Старшыня: — пазбаўляю вас слова.

Жарскі: — вы пазбаўляеце мяне майго права абараняцца.

Старшыня: — вам прадастаўлена слова для заявы, а не для агітацыі.

Жарскі: — мая прысутнасьць на лаве падсудных—лепшая агітацыя.

Старшыня:—вы пазбаўлены слова.

Жарскі:—так наступае клясава-фашысцкі суд. Масы ўсё роўна пачуюць мяне.

Пасьля спрэчак бакоў вечарам вынесен прыгавор.

Райх і Жарскі прыгавораны да 8 год катаржнай турмы кожны. Як ужо паведамлялася некалькі дзён таму назад, Жарскі быў прыгавораны па другой справе ў Лодзі таксама да 8 год катаржнай турмы.

Ісляндыя

Соцыял - дэмократычны саюз далучыўся да КІМ'у

Зьезд соцыял-стычнага саюзу моладзі Ісляндыі, які нядаўна адбыўся ў Сіглюфіордзе, рашыў далучыцца да КІМ'у. З самага пачатку паседжаньня большасьць удзельнікаў зьезду рэзка выступала супроць політыкі, якая праводзілася да гэтага часу саюз м.

Прэзыдыум, пераканаўшыся, што яго падтрымоўвае толькі нязначная меншасьць, спрабаваў сарваць зьезд тым, што пакінуў залю паседжаньня. За ім пасьледвала толькі 12 дэлегатаў з Рэйкіявіку.

Прадстаўнікі іншых раёнаў у колькасьці 30 чалавек працягвалі засяданьне. Зьезд вырашыў абраць новае кіраўніцтва Саюзу і зьвярнуўся ў КІМ з заявай аб жаданьні ўступіць у яго шэрагі.

Прокурор імкнуўся справацыраваць

БЭРЛІН, 6. На процэсе 11 комсамольцаў арыштаваных у час зьлёту рабочай моладзі ў Лейпцыгу ў красавіку гэтага году адзін з падсудных заявіў, што да яго ў камару зьявіўся прокурор, які выдаў сябе за абаронцу і імкнуўся справацыраваць патрэбныя яму паказаньні. Гэта заява выклікала вялізарнае абурэньне ў залі суда. **Прокурор змушаны быў прызнаць, што ён сапраўды гэтакім мэтодам імкнуўся дабіцца адпаведных паказаньняў.**

Руйнуючы агонь па праваму опортунізму

У Нацкім сельсавеце плян не даведзен да вёсак, опортуністы Ігнатоўскага сельсавету абараняюць к лакоў, Петрыкаўскі раён не падрыхтаваў склады

Шырока разгортваючы генэральную праверку, мобілізуючы колы працоўнага сялянства, разгортваючы соцспаборніцтва пам колгасаў і вёсак, організуючы чырвоныя хлебныя абозы,—зломім спробы кулакоў і правых опортуністых, сарваць загатоўк

Поўнасьцю выканаем плян хлебазагатовак

Рэалізуем адозву ЦК УсеКП(б)

Бягомльская комсамольская організацыя, прапрацаваўшы адозву ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі прарываў, організавала шырокую масавую працу па барацьбе з прарывамі хлебазарыхтоўчай кампаніі.

Ячэйка Бягомльскага с-савету організавала брыгады, якія праводзяць па вёсках масавую працу і організацыю чырвоных абозаў. У выніку Бягомльскі сельсавет замест былых 30 проц. выкананьня пляну зараз выканаў яго амаль поўнасьцю.

Зараз райком комсамолу накіраваў на дапамогу ячэйкам брыгады, якія працуюць па ліквідацыі фінансавых прарываў і ўборцы бульбы. Усяго ў брыгадах працуе 119 чалавек.

Г. Ч.

Плян хлезабазагатовак выканалі

Вёска Смык-Слабада, Асіпавіцкага раёну, добра адгукнулася на правядзеньне хлебазагатоўчай кампаніі. Разьвёрстка выканана на 100 проц.

На сходзе па загатоўцы бульбы бедната і серадняцтва добраахвотна ўнесьлі 220 пуд. бульбы.

Ва ўсёй праводзімай па хлебазагатоўцы працы комсамольцы вёскі прымаюць актыўны ўдзел.

Налівайка.

Збожжазагатоўкі пад пагрозаю зрыву

Верасьнёўскі плян збожжазагатовак па Крупскаму раёну на 25-га верасьня выкананы на 100 проц. Але кулацкія гаспадаркі, якім уручаны цьвёрдыя заданьні, знаходзяцца ў пашане сельсаветаў. Так, па Ігрушацкаму сельсавету ёсьць выпадак, калі кулаку вёскі Самаседаўка ўручана заданьне здаць збожжа ў колькасьці 100 пудоў, але здадзена ім толькі 49 пудоў.

Рад заможных гаспадарак па гэтай вёсцы не выканалі здачу. Між тым, ні сельсавет, ні камісія садзейнічаньня, ні ўпаўнаважаны РВК не сачылі за тэрмінамі здачы хлеба кулакамі.

Плян бульбазагатовак па ўсяму раёну да паасобнага двара не даведзены. Кулакам не дадзены цьвёрдыя пляны; не абавязалі іх тэрмінова капаць бульбу. Сельсавет ніякіх мер не прымае да спагнаньня пратэрмінованай запазычанасьці ад кулакоў.

Па Начскаму сельсавету верасеньскі плян збожжазагатовак выкананы толькі на 10 проц. Плян бульбазагатовак і тут да паасобнага двара не даведзены.

Па Выдрыцкаму сельсавету плян бульбазагатовак на 25 верасьня нават не абмяркоўваўся і прэзыдыумам сельсавету. Копка бульбы па калгасах яшчэ не распачалася з прычыны таго, што калгасы яшчэ ня скончылі восеньні сеў і не ўбралі каля 15 гэктараў сенажаці.

Па Ухвальскаму сельсавету індывідуальным сэктарам яшчэ не засеяна каля 25 проц. плошчы асеньняга кліну з прычыны адсутнічаньня насеньня. Наогул па ўсяму раёну вакол пытаньня загатовак і ў прыватнасьці бульбазагатовак не мабілізавана грамадзкасьць. Райпрафбюро ніякай працы ў гэтай галіне не праводзіла.

Шэстапалаў.

Петрыкаўцы псуюць збожжа

Па Пятрыкоўскім раёне організавана шмат прыёмачна ссыпных пунктаў збожжа але пункты адпаведным чынам не абсталяваны. Напрыклад, Капцэвіцкі нарыхтоўчы пункт, які абслугоўвае два шматнаселеныя сельсаветы, ня мае нават перагародак для розных гатункаў збожжа.

У выніку ёсьць шэраг фактаў, калі розныя гатункі збожжа зьмяшаны, чым псуецца яго якасьць.

Патрэбна адпаведным органам прыняць меры да спыненьня такіх бясчынстваў.

Я. Крушына.

У опортуністычным балоце

Комсамольская ячэйка Суцінскага сельсавету ня прымае аніякага ўдзелу ў правядзеньні хлебазагатоўчай кампаніі.

Праца па давядзеньню пляну да вёсак праводзілася бяз удзелу комсамольскай організацыі. Масавая праца па організацыі чырвоных абозаў таксама праводзіцца выключна сельсаветам і партыйцамі, якія маюцца ў сельсавеце.

Комсамольская-ж ячэйка, спадзяючыся на самацёк, стаіць у баку ад гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства.

М.

КАМАРЫНСКІ С-С. ЗРЫВАЕ ХЛЕБАЗАГАТО

Камарынскі сельсавет Петрыкаўскага раёну зусім ня кіруе працай па правядзеньню хлебазагатоўчай кампаніі. Сельсавет ня толькі не разгарнуў масавае працы і працы па праверцы выкананьня вёскамі і колгасамі плянаў хлебазагатовак, але ня прымае ніякага ўдзелу нават у організацыі чырвоных абозаў па вёсках.

Маецца шэраг фактаў, калі бядняцка серадняцкія аднаасобныя гаспадаркі стыхійна організуюць чырвоныя абозы, пра якія сельсавет зусім ня ведае. У вёсцы Камар... бедната і серадняцтва організ... чырвоны абоз. Сельсавет, які ... дзіцца ў гэтай вёсцы, ня пр... удзелу ў організацыі абозу. ... шыня с-с. навят ня вышаў па... дзець, што гэта за абоз.

Такая безадказнасьць сельс... ў хлебазагатоўчай справе і ... на самацёк прывялі да таго, ... пляны па сельсавеце далёка ... выкананы.

Рэз...

Рашуча змагацца з фактамі выкрыўленьня клясавай лініі

У паасобных вёсках Сьміла́ўскага раёну пры правядзеньні хлебазаготовак маюцца паасобныя факты скажэньня клясавай лініі. У вёсцы Старына пры давядзеньні пляну хлебазагатовак рабілі так: бедняку давалі заданьне здаць 4-5 пудоў лішкаў хлеба, а заможным гаспадаркам 10-15, тады як заможным можна было даць цьвёрдае заданьне ў 40-50 пудоў (грамадзяне Юшка Кастусь, Заранчук Янка).

Патрэбна адпаведным органам праверыць па чыёй віне здарыўся гэты факт і прыняць належныя меры.

С.

Студэнты на хлебазагат... ках

Студэнты Марына-Горскага ва-гародніцкага тэхнікуму акт... ўдзельнічаюць у правядзеньні базагатоўчай кампаніі. Амаль ... ны дзень колектыў студэнцтв... кіроўвае па сельсаветах ... 15-20 чал., якія там право... працу.

У выніку шырока праведз... масавай працы сярод бядняцк... радняцкіх аднаасобных гаспа... у раёне ўжо нарыхтавана 800... хлеба.

Разам з правядзеньнем хле... гатоўчай кампаніі студэнты пр... вялікую працу сярод моладзі, ... павінна ісьці ў Чырвоную ...

Міф...



Адчынеце сэмафоры комсамольскім эшалёнам!

Рашуча даць па кулацкім спробам сарваць бульбазагатоўкі

Заслаўе, 6. (Ад нашага юнкора). Надзвычайна слаба праходзіць бульбазагатоўчая кампанія па Заслаўскім раёне. Кантрольныя лічбы не даведзены да большасьці кулацкіх гаспадарак. У шэрагу вёсак, дзякуючы адсутнасьці масавай працы сярод колгасьнікаў і адзіналічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, актывізаваўшаеся кулацтва, пралезшы ў тройку па вызначэньню кантрольных, заданьняў зрывае давядзеньне пляну да вёсак на 50-75 проц. У вёсцы Угланы сарвалі на 50 проц. Згодна заданьню РВК, гэта вёска павінна была даць 30400 кілёграм, а кантрольную лічбу прынялі толькі на 17500 кілёграм.

Аднача́сова з гэтым, дзякуючы непадрыхтаванасьці партыйных і комсамольскіх ячэек да рашучага адпору кулацкім спробам сарваць бульбазагатоўчую кампанію і адсутнасьці працы сярод колгасьнікаў, беднаты і серадняцтва, кулацтва распаўсюджвае розную хлусьню, што „ўсю бульбу і хлеб адпраўляюць за межы, самі будзеце галадаць“ і г. д., што зрывае своечасовую здачу бульбы згодна пляну.

У коопэрацыйныя крамы Сёмкава-Гарадзецкага і Гатовінскага сельсаветаў яшчэ не паступіла ніводнага кілёграма бульбы. Працу па організацыі чырвоных абозаў ні партыйная, ні комсамольская ячэйкі не праводзяць.

„Бульбазагатоўкі — гэта справа сельсавету, а не ячэек“,—так заяўляюць паасобныя кіраўнікі комсамольскіх ячэек, апраўдваючы гэтым сваю бяздзейнасьць.

Згодна пастановы РВК, кулацка-заможныя гаспадаркі павінны да 10 кастрычніка здаць вызначаныя ім цьвёрдыя заданьні, але ад іх паступае вельмі слаба.

Усё гэта патрабуе ад р... партыйна-комсамольскай орган... на-ўдарнаму пераключыць зьвеньні на правядзеньне бул... гатовак. Разгарнуць масаву... цу, організаваўшы колгас... беднякоў і серадзякоў даць ... чы адпор кулацкім спробам с... выкананьне пляну бульбазаг... і прымусіць іх выканаць ц... заданьне да тэрміну. Адна... накіраваць руйную... ы удар па ... тунiстычнай практыцы паас... партыйна-комсамольскіх ячэе...

Слуцак адпраўляе першы эшалён

СЛУЦАК, 6. Сёмага організоўваем адпраў... з Слуцку эшалёну. Наладжана бесьперабой... адгрузка і прыём бульбы, організаваны ўд... ныя брыгады, прыкладная сустрэча абозаў, ... ганізаваны чай, ларок. Слуцкам накірава... брыгады ў раёны для дапамогі ў падрыхтоў... У Грэскі раён паслана брыгада для капан... бульбы.

АНІСАЎ.

За Слуцкам—Магілеў

МАГІЛЕЎ, 6. Першы эшалён бульбы ў ... скву адпраўляем 10-га кастрычніка.

КАЗЛОЎ.

200 тысяч руб. прамтаварамі—на прэміяваньне за ўборку

Пастанова Эканамічнай Нарады пры СНК БССР

У разьвіцьцё пастановы Савету Народных Камісараў БССР ад 3 кастрычніка г. г. „Пра ход загатоўкі і адгрузкі бульбы“ (апублікаванай у газэце „Савецкая Беларусь“ № 231 за 4 кастрычніка 1930 г.), Эканамічная Нарада БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю вылучыць фонд з прамтавараў на суму да 200 тыс. рублёў для прэміяваньня рабочае сілы, якая спэцыяльна набіраецца савецкімі і колектыўнымі гаспадаркамі для капаньня бульбы.

2. Прэміяваньне рабіць у раз меры 20 проц. агульнай сумы, што выплачваецца выключна наёмнай рабочай сіле за капаньне бульбы, паводле сьпісаў, складзеных кіраўнікамі савецкіх гаспадарак і кіраўніцтвамі колгасаў, на якіх ускладаецца адказнасьць за правільнае складаньне гэтых сьпісаў.

3. Да атрыманьня з саюзных рэсурсаў памянёных у арт. 1 фондаў, прапанаваць Наркомгандлю і Белкоопсаюзу забясьпечыць безадкладную выдачу гэтых фондаў з наяўных рэсурсаў. Даручыць Белкоопсаюзу, з прыцягненьнем Белколгасцэнтру і Бел...трэсту на працягу 24-х гадзін разьмеркаваць гэты фонд па раёнах і спажывецкіх таварыствах.

4. Прапанаваць Наркомгандлю і Белкоопсаюзу тэрмінова ўзьняць у саюзных органах пытаньне аб прыраўнаньні тэрміну адгрузкі для БССР прамтавараў на прэміяваньне здатчыкаў бульбы да тэрміну адгрузкі гэтых тавараў у асноўныя збожжазагатоўчыя раёны Саюзу ССР.

5. Забараніць раённым выканаўчым камітэтам перагляд пляна́ў бульбазагатовак у бок іх памяншэньня.

6. Адзначаючы, што некаторыя раённыя выканаўчыя камітэты абмяжоўваюць дзейнасьць спажывецкай коопэрацыі ў галіне загатоўкі бульбы праз вызначэньне для яе некаторай колькасьці сельсаветаў, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам скасаваць усякія абмежаваньні ў рабоце спажывецкай коопэрацыі, апроч работы ў прызаводзкай зоне, якая ўстанаўляецца ў поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй Наркомгандлю.

7. Пацьвердзіць ранейшую пастанову ЭКАНА аб устанаўленьні дзьвёх цэн на бульбу: на сталовую бульбу 3 р. 60 к. і тэхнічную—3 р. 12 к. за цэнтнэр.

Час. в. аб. Старшыні Эканамічнае Нарады БССР **А. Калнін**

Нам. кіраўніцтва Спраў СНК і ЭКАНА БССР **Дубавіц І.**

На конфэрэнцыі ўдарнікаў Фрунзэўскага раёну

КОЖНЫ КОМСАМОЛЕЦ—УДАРНІК!

...ОЖНЫ УДАРНІК-КОМСАМОЛЕЦ,

фабрык, заводаў, рыштаваньняў і майстэрань рапартуем.

Напруджваючы ўсе патугі, мы змагаліся за ліквідацыю прарыву. Аб гэтым сьведчаць лічбы. 5-ы квартал скарыстаем для навярстаньня ўпушчанага і яшчэ шпарчэйшага разгортваньня будаўніцтва. Шэрагі комсамолу папоўнім новымі сотнямі лепшых ударнікаў.

НА ЎСІХ ФРАНТОХ ЗМАГАЦЦА ЗА ПЯЦІГОДКУ

...ры ўваходзе ў залю клюбу ...асьветы кідаюцца ў вочы пля... і лёнунгі:—

„Кожны комсамолец—ударнік, ...ны ўдарнік—комсамолец“.

„На бязьлітасную барацьбу з ...ном, прагульшчыкам, рвачом, ...іцай“.

„Нямецкую тэхніку—бальша..., бальшавіцкую практыку—...цкім рабочым“.

...дзіньнік адбівае 6 удараў, але ... яшчэ ня поўны. Сэкратар ...ому хвалюецца, што такая кон...нцыя, як конфэрэнцыя ўдарні... пачнецца з некаторым спазь...нем. Вядомая справа, сэкратар ...аве хвалявацца. Але ў праве за...цца і дэлегаты конфэрэнцыі,— ...па-ўдарнаму спаборнічалі за ...татамі да апошняй хвіліны. ... толькі-што ад вагранкі. У ...ага на твары яшчэ выразна ...аецца суровая напружанасьць ...дзкіх будняў, некаторыя не ...елі памыцца. У галаве кож... яшчэ аддаецца шум і ляска...е фабрычных машын.

...онфэрэнцыю адчыняе сэкратар ...зэўскага райкому комсамолу— **Райхельсон.** Маленькая пра...:

— Мы цяпер ставім пытаньне, ...жа тав. **Райхельсон,** ня толь...выканаць прамфінплян, але і ...выканаць яго. **Нам неабход... ўзяць шэфства над рабо...і прапановамі, адразу да...ячы да рабочага, што зроб... па яго прапанове.**

...але як можа правесьці ў жыцьцё ...альбо іншую прапанову рабо... **такая ячэйка як, напрыклад, ...ьводу“. Гэта ячэйка яшчэ ... сёньня не распрацавала ...звы ЦК УсеКП(б)!**

...галашаецца склад прэзыдыуму. ...ганаровы прэзыдыум конфэ...цыя абрала **політбюро ЦК ...КП(б), тав. Гея і сэкратара УсеЛКСМ—Косарава.** Хваля ...ескаў залівае залю.

...онфэрэнцыя ўважліва слухае ...страцыю лічбовых паказчыкаў ...а другога году пяцігодкі і за... трэцяга году.

...акладвае нам. старшыні ВСНГБ ...ав. **Васкабойнікаў:**

— Усяго некалькі дзён таму ...д рабочая кляса адзначала канец II-га году пяцігодкі. Працоўныя Беларусі маюць надзвычайна многа дасягненьняў у выкананьні генэральнай працы па перабудаваньню краіны. Побач з гэтым маюцца і недахопы. Мы засталіся ў запазычанасьці **на 4 проц., мы ўвогуле недавыканалі плян другога году пяцігодкі.**

Недавыканалі заданьне па зьніжэньню сабекошту на 2 проц., ня выканалі заданьне па якасьці продукцыі.

Гэтыя лічбы зусім грунтоўна і цьвяроза паказваюць на тое, што ня было дастатковага кіраўніцтва паасобнымі прадпрыемствамі з нашага боку.

Часамі кіраўніцтва паасобных прадпрыемстваў даходзіла нават да опортуністычнага кіраўніцтва. У гэтым прарыве яскрава выяўляецца ўся агіднасьць, шкоднасьць так званага лятунства, р...ацтва, ілжэўдарніцтва і г. д.

Калі ж узяць паасобныя галіны прамысловасьці, то будзем мець такі малюнак: па вытворчасьці будматар'ялаў прарыў складае 25 проц., па фосфарытнай прамысловасьці недавыпушчана 50 проц., па мэталёвай прамысловасьці недавыканалі плян на 10 проц., па торпу недавыканалі **30 проц, тады як торп ва ўмовах БСС... зьяўляецца галоўным пал...м.**

Заўважана, што прарывы маюць месца галоўным чынам ня там, дзе не хапае сыравіны, а там, дзе сыравіны маецца даволі (Віцебскія заводы). У выніку мы маем наступнае:

На пляну патрэбна было, каб рэспубліканская прамысловасьць у другім годзе пяцігодкі дала продукцыі на 388 млн. рублёў, але ў гэтым-жа годзе мы маем продукцыі значна больш—на 483 млн. рублёў. Гэта лічба была-б куды вышэй, каб ня буйныя прарывы ў галоўных галінах прамысловасьці.

На наступную кварту пасьля другога году крэдытавана 18 млн. рублёў з тым, каб, разгарнуўшы сапраўды баявыя тэмпы работы, ня толькі навярстаць упушчанае і зьвярнуць запазычанасьць 2-му году пяцігодкі, але і перавыканаць пляны. **„Ва што-б там ні стала,— кажа тав. Васкабойнікаў,—мы павінны выканаць пабудову заводаў, якія прызначаны для будматар'ялаў!“**

У першы год пяцігодкі ў БССР было ўкладзена 25 млн. рублёў, у другі год—42 млн. рублёў, а ў трэці год на будаваньне нашай прамысловасьці укладаецца 118 млн. рублёў.

Надзвычайна вострыя недахопы м...юцца і ў рабочай сіле. Па БССР лічыцца 50000 рабочых, тады як для заканчэньня работ 3-га году пяцігодкі патрэбна 70000 рабочых. Ня гледзячы на такое вострае становішча з рабочаю сілаю, дырэктывы партыі аб пераключэньні працы на новыя тэмпы ў шмат якіх мясцох у жыцьцё яшчэ не праведзены.

Яшчэ горш справа з тэхнічнымі кадрамі. Тэхнічных кадраў мы маем толькі два з паловай процанты патрэбнай нам колькасьці для рэспубліканскай прамысловасьці, а для мясцовай прамысловасьці (саматужнай, інвалідная і інш.) мы маем... усяго толькі 0,7 проц. патрэбнага ліку рабочых.

Пачаліся спрэчкі.

Тав. Хэйман—(ф-ка „Кастрычнік“). Наша швейная ф-ка дапусьціла вялікую памылку. Пры складаньні сустрэчнага прамфінпляну пагналіся толькі за колькаснымі паказальнікамі, упусьціўшы якасьць, дзякуючы чаму на заводзе былі значныя прарывы (вядомы студзеньскі прарыў), але зараз, шляхам стварэньня ўдарных брыгад, батальёнаў энтузіястых мы на 46 проц. паднялі вытворчасьць працы і ліквідавалі прарыў.

Тав. Гурэвіч (Белдзяржбуд): Белдзяржбудаўцы працуюць па-ўдарнаму. З посьпехам спраўляюцца з пабудовай абутковае фабрыкі. Для шмат якіх дэталяй не хапае матар'ялаў. Але дзякуючы нашым ударным брыгадам, іх вопытнасьці, мы з такога становішча выходзім і прасоўваем працу наперад.

Тав. Сызук (завод Дрэваапрацоўшчык). Прамфінплян па лесарэзнай вытворчасьці выканалі на 104,33 проц., з перавыкананьнем на 4,33 проц. Гэта—на 15 верасьня, а па мэблёвай вытворчасьці, на 11 верасьня плян перавыканан на 6,5 проц. Патрэбна, каб ВСНГБ ударным парадкам паклапаціўся аб пабудове сушні, што значна пасуне наперад мэблёвую вытворчасьць. Мы вядзем рашучую барацьбу з ілжэ-ўдарнікамі, што выяўляецца ў паказальна-масавых судох, заносах на чорныя дошкі і г. д.

Тав. Масьлянскі (ф-ка „Беларуска“). Патрэбна было зьнізіць сабекошт на 18 проц., а зьнізілі на 22 проц. Актыўнасьць рабочых у выкананьні пастаўленых задач вялікая. За гэта гаворыць тое, што пры складаньні прамфінпляну было пададзена рабочымі 100 прапаноў, з якіх палова прыпадае на рабочую моладзь.

Пры складаньні прамфінпляну самі рабочыя высунулі на 33 проц. большае заданьне, чым высоўвала ім адміністрацыя.

У час спрэчак у прэзыдыум конфэрэнцыі паступілі 2 колектыўныя заявы ад рабочае моладзі з прось...бай залічэньня яе ў шэрагі комсамолу.

Адна з іх:

> *2-й Фрунзэўскай раённай конфэрэнцыі рабочае моладзі*
>
> **Заява**
>
> Просім залічыць нас у шэрагі комсамолу. Бярэм на сябе абавязкі выконваць усе дырэктывы комсамолу і партыі. Мы абавязваемся быць шчырымі перадавікамі-застрэльшчыкамі ў соцыялістычным спаборніцтве, ударніцтве, у выкананьні і перавыкананьні прэмфінпляну.
>
> 16 подпісаў.

Другая заява такога-ж зьместу, і мае 22 подпісы. Ёсьць заяўкі індывідуальнага парадку аб наступленьні ў комсамол.


Другая раённая конфэрэнцыя праходзіць пры асаблівым уздыме і актыўным удзеле ўсіх ударнікаў.

Тодар Алесін.

Ударам ударных брыгад...

... ...якучасьць рабочае сілы зрывае выкананьне прамфінпляну...

... Вялікі брак і прагул... да гэтага часу ня зьнішчаны і зьяўляюцца буйн... іншымі тармазамі ў справе выкананьня прамфінплянаў... (з газэт).



...Ударым па гэтых гнідах!

Організаваны комсамольскі батальлён

Учора комсамольцы другой зьмены Менскай абутковай фабрыкі на сваім сходзе рашылі лічыць комсамол фабрыкі комсамольскім батальёнам.

Комсамол другой зьме...ы фабрыкі запэўнівае, што ён пакладзе ўсе сілы на ліквідацыю прарыву і перавык...наньне заданьня. Ц.

* * *

На Менскай абутковай фабрыцы ўчора організаваны ва ўсіх цэхах юнкораўскія пасты, якія будуць штодзённа інформаваць газэту аб ходзе працы на фабрыцы. Ц.

Бязвусыя энтузіястыя

...аранная і напружаная праца па...уе чоткіх рухаў і вялікай піль...ці. Гутарак, песень, якія калісьці ...сталым і верным спадарожнікам ...тніцы, песьні, якая ірвалася ў ...ь, білася ў з...ычэныя вокны, тут ...ачуеш. Жанчыны-работніцы пры...ліся маўкліва слухаць нястройны ...прабівачных машын.

...алы састаўлены ў чатырохкутні...раходы між імі расквечаны сіньню ...вопраткі і чырваньню хустак.

...лянтарэйная фабрыка „Беларуска“ ...вае толькі два гады свайго існа...вя. На маладой фабрыцы такі-ж ...цы людзкі склад. Большасьць ра...х набывала стаж і кваліфікацыю ...віта на „Беларусцы“.

...а фабрычн...м двары, па карпусах ...ў, аддзяленьнях, у канторы,— ...ы. на кожным вучастку фабрычорганізму гутаркі толькі аб ...м. Над фабрыкай цяжкаю, чор... хмарай нав...с прарыў. Таму па ...х і аддзяленьнях, ад варштата да ...тата паўзе загад:

— Ня здацца!.. Ня здрэйфіць!..

...оказаць, а не тут 40 проц. усяго ...ду рабочых,—піонэры штурмавога ...ду.

...авярстаць упушчанае ня так ...а. Але-ж пакрыць 56 проц. неда...нання прамфінпляну за першы ...тал гаспадарчага году неабходна. ...чаму-ж здарыўся прарыў? Чаму ...кі 44 проц. выкананьня прамфін...у? Хто вінаваты?

...адміністрацыя дабраду...нічала. Фабком наогул спаў, а калі і прачынаўся —пачынаў толькі засядаць. Партыйны і комсамольскі колектывы вырашалі „бягучыя справы“. „Працавалі“ усе, ал ніхто нічога не зрабіў. І толькі бяздоньне прарыву паставіла пытаньне рубам, „альбо—альбо“.

Альбо пакрыць прарыў, альбо распісацца ў сваёй бязмоцнасьці?

І тады папаўзла ўвышыню крывая выпрацоўкі і калёнкі паказчыкаў прамфінпляну пачалі сыстэматычна пераходзіць за 100 проц. Жнівень месяц даў 102 проц. выкананьня прамфінпляну, перш...я палова верасьня 106 проц, а другая палова дала рэкордную лічбу—135 проц.

На 5,9 проц. перавыканана заданьне п... зьніжэньню сабекошту.

Але-ж пр...рыў першага кварталу ня так лёгка пакрыць. 12 проц. прамфінпляну за год недавыкананы. Вось аб гэтых 12 проц. крычаць зараз лёзунгі, аб гэтых 12 проц. гав...раць на ўсіх сходах і нарадах, і на штурм іх выступае рабочы к...лектыў, у авангардзе з ударнікамі і батальёнам энтузіястых.

* * *

Батальён энтузіястых яшчэ зусім малады. 45 чалав...к байцоў. Мэта—ліквідацыя прарыву, Програма дзеяньняў—на кожным кроку, штодня што га...зіны п...скараць тэмпы

Статут—асабістым прыкладам запаляць рабочых.

— Не адмаўляюцца ні ад якой работы.

Замацоўвацца за фабрыкай да канца пяцігодкі.

Асноўнае асяродзьдзе батальёну—фабрычны комсамол і моладзь. Энтузіясты малады. Але задор маладосьці, памножаны на ўпарт...сьць у саюзе з вывучкай і загартаванасьцю — дасьць вынікі. Ды яшчэ і якія.

Хто першы зака...трактаваў...я?—Моладзь. А зараз палова рабочых законтрактавалася за фабрыкай да канца пяцігодкі. 200—з 400. У палатняным аддзяленьні гузікавага цэху можна па пальц...х пералічыць ...ых, хто не законтрактаваўся. Адзін, два тр...—здаецца больш няма.

* * *

Ня трэба шукаць гэрояў сярод энтузіястых. Гэроі—адзінкі, а тут колектыў. Што зрабіў-бы адзін Паперка? Той са...ы комсамолец Паперка, які некалькі раз зьніжаў добраахвотна расцэнкі, калі-б ён быў адзін?

Альбо комсамолка Леў, якая, працуючы 6 гадзін як падлетак дае норм... 20-21 грос, тады як норма за 7-гадзінны працоўны дзе...ь для работніцы—17 грос. Альбо маладыя работніцы Бэрнштэйн і Гантман? Што-б яны, зрабілі будучы адны?

А вось, калі колектывы такіх як Паперка і Леў, Бэрнштэйн і Гантман, сваім энтузіязмам ідуць у першых шэрагах колектыву, тады гэроем з...яўл...ецца колектыў.

А хіба-ж ганаровае званьне комса...ольца, ці званьне рабочага соцыялістычнай прамысловасьці не абавязвае быць энтузіястым?

У моладзі сіла сьвяжэйшая, але ў старых—кваліфікацыя і вывучка. І калі старыя запаляюцца маладым задорам, яны становяцца энтузіястымі. Так давайце вучыцца ў старых кваліфік...цыі і вучыць старых энтузіязму.

* * *

Ударны правільны цэх. Тут рогі жывёлы апальваюцца ў печах, падразаюцца і разгінаюцца ў пласткі. Маленькія печы з навісл...мі шырокімі квадратамі дымаходаў. Цяжкі і дурм...яны пах смальна...а. Ад усяго гэта...а нясе дапатопнай саматужнасьцю. А побач, у другіх цэхах і аддзяленьнях новенькае абсталяваньне, электрычныя прэсы і пліткі, роўны ход матораў і машын.

— Не дадумаліся яшчэ інжынэры мэханізаваць н...ш процэс... За мяжой і то няма лепшых машын,—тлумачыць майстар.

Правільны цэх—у асноўн...м маладзё...ны. Гэта ён ад...ін з першых абвясьціў сябе ўдарным. А калі на фабрыцы вырасла пагроза нястачы галяліту, што д...ло-б цяжкі ўдар па прамфінпляну, правільшчыкі, мобілізаваўшыся на папаўненьне запасаў паўфабрыкатаў, адмо...іліся ад выхадных дзён. Пачын правільшчыкў падхапі...а комсамольская організацыя фабрыкі. Перад выхадным...і днямі прыходзяць комсамольцы ў яч...йку і правяраючы паказчыкі прамфінпляну па свайму цэху, вырашаюць: прац...ваць у выхадны дзень, ці не?

Ва ўдарным правільным цэху ня было ніводнага прагулу. Гэтым ганарыліся правільшчыкі. А вось—гэтымі днямі прагуляў адзін рабочы, нядаўна прыняты на фабрыку. Лыжка дзёгцю сапсавала бочку мёду.

Назаўтра прагульшчыка цэх „узяў у стос“.

— Абчэшацца хлопец... і яшчэ як запрацуе,—кажа мне ўдарнік правільнага цэху—сэкратар заводзкага комсамолу—Масьлянскі, і ва ўхмылцы шчэрацца яго зубы,—а не перавыхаваем, дык,—ён робіць досыць выразны гэст у напрамку фабрычнае брамы,— папросім зачыніць фортку з таго боку.

* * *

Па сустрэчнаму прамфінпляну грэбянёвы цэх ўзяў на сябе аб...вязак павысіць вытворчасьць працы на 41 проц.

На вытворчай нарадзе грэбянёвага цэху было шмат выступленьняў. Кожны гаварыў аб тым, як выканаць прамфінплян і заданьні па свайму варштату.

Правільна сказала адна з выступаўшых работніц на вытворчай нарадзе:

— Мы-ж самі высунулі сустрэчны. Гэта ж наш плян... А калі ўзялі,— трэба выканаць і баста.

У прынятай пастанове аднадушна запісалі:

„Пакрыць прарыў і выканаць вызначаны прамфінплян да 1 студзеня 1931 году“.

... І баста.

Ал. Ліпнёвы.

Менск, галянтарэйная фабрыка „Беларуска“.

Генеральная праверка

Пагроза зрыву сяўбы яшчэ не адведзена

Па-бальшавіцку змагацца за скančэньне сяўбы і за новы колгасны прыбой

Самым рашучым чынам змагацца супроць права-опортуністычнага дабрадушша, якое разьлічвае на самацёк

ЗА ОРГАНІЗАВАНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ 3-га ГОДУ С.-ГАС. ПЯЦІГОДКІ

Высокая даходнасьць колектыўнай працы, правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і пасьпяховае правядзеньне колгасамі асеньняй сяўбы, якія выклікалі такую магутную хвалю прыліву ў колгасы новых соцень і тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ужо цяпер сьведчаць аб тым, што завяршэньне ў асноўным колектывізацыі ўсяе сельскае гаспадаркі да канца пяцігодкі будзе забясьпечана.

Але масавы прыліў у колгасы павінен сустрэць з боку ўсіх мясцовых грамадзкіх організацый (партыйных і комсамольскіх у першую чаргу), усебаковую кіраўнічую, організатарскую дапамогу. Трэба самым рашучым чынам змагацца супроць права-опортуністычнага дабрадушша некаторых мясцовых організацый, якія разьлічваюць на самацёк і разважаюць прыкладна так; „Цяпер усё само па сабе абойдзецца". Адначасова трэба абвясьціць бязьлітасную барацьбу і тым, якія, як паказаў вопыт, ставяць усялякія перашкоды сялянам, каторыя жадаюць уступіць у колгасы. Само сабою зразумела, што тут ня можа быць і гутаркі аб цярпімых адносінах і да тых „звышколектывізатараў", да тых „левых" загібшчыкаў, якія патрабуюць загадзя ўстаноўленых цьвёрдых норм колектывізацыі і схільны да адміністраваньня, замест пасьлядоўнага правядзеньня ленінскай добраахвотнасьці, замест штодзённага ўпартага ўдзелу ў справе організацыі і замацаваньня ўсё растучага колгаснага руху.

Актыўная дапамога новай магутнай колгаснай хвалі з боку мясцовых партыйных, комсамольскіх, профэсыйных і савецкіх організацый павінна быць забясьпечана штодзённым сыстэматычным удзелам у працы па хутчэйшаму аформленьню новых колгасаў, дапамогі ім працаўнікамі-організатарамі і гэтак далей.

Трэці год пяцігодкі павінен ня толькі замацаваць дасягнутыя намі посьпехі ў другім годзе, але і забясьпечыць больш хутчэйшыя тэмпы колектывізацыі.

Цяпер ужо цэнтр цяжару ўсяе працы па колектывізацыі ня столькі ў тым, каб агітаваць за колгас, але ў тым, каб агітуючы за яго, практычна дапамагаць бядняцка-серадняцкім масам сялянства ажыцьцяўляць колектывізацыю, быць нястанным організатарам і кіраўніком масавых прыліваў у колгасы.

Ужо цяпер, у першы год новай сельска-гаспадарчай пяцігодкі, мы павінны ў асноўным закончыць колектывізацыю на паўночным Каўказе, Сярэдняй і Ніжняй Волзе.

Колгасны прыліў павінен замацаваць у колгасах да вясны 1931 году больш 11 мільёнаў сялянскіх гаспадарак па ўсім Саюзе. З 1931 году пасеўная плошча колгасаў павінна скласьці ня менш 72-73 мільёнаў га, (агульная пасеўная плошча павінна быць давед зена да гэтага часу да 145-148 мільёнаў га). Такім чынам удзельная вага колгасаў, у агульнай пасеўнай плошчы Саюзу, у 1931 годзе павінна павысіцца (без саўгасаў) да 50 проц., супроць 28,08 у 1929-30 годзе, а па яравых культурах—да 60 проц., супроць 31,1 проц. у 1929-30 годзе. Адпаведна з гэтым павялічваецца і колькасьць колгасаў з адначасовым іх узбуйненьнем.

Колгасы ў 1931 годзе павінны адыграць выключна ва[жн]ую ролю ў разьвіцьці жывёлагадоўлі. Колькасьць рагатае жывёлы і авец у колгасах павінна ўзрасьці ў 2 з пал. разы супроць 1930 году; колькасьць сьвіней павінна ўзрасьці больш чым у 9 разоў, г. зн. на 900 проц.

Адначасова 1931 год павінен быць годам узмоцненай падрыхтоўкі да вытворчага коопэраваньня найбольш адсталых і, галоўным чынам, спажывецкіх раёнаў.

Вытворчае коопэраваньне разам з колгасамі павінна ахапіць ужо вясною 1931 году да 82 проц. сялянскіх гаспадарак і ўвосень таго ж самага году —да 92 проц.

Натуральна, што ўсе гэтыя задачы ў 3 годзе пяцігодкі могуць быць зьдзейсьнены пры самым актыўным удзеле мясцовых організацый і саміх колгасьнікаў у справе організацыі і замацаваньня новай колгаснай хвалі, пры самай энэргічнай барацьбе з кулацтвам і кулацкай агэнтурай—правым опортунізмам, а таксама „левымі" заскокамі. „Партыя дабілася рашаючага пералому ў справе колектывізацыі дзякуючы таму, што былі разгромлены, як контррэволюцыйны троцкізм, палітыка якога нямінуча вяла да разрыву змычкі з асноўнымі масамі сялянства, так і правыя ўхілістыя з іх палітыкай адмаўленьня ад правадзімай партыяй індустрыялізацыі краіны, адмаўленьня ад насаджэньня саўгасаў і разьвіцьця колгасаў з іх палітыкай капітуляцыі перад кулацтвам" (Пастанова XVI партзьезду).

І. Паўловіч

Папярэдзіць пагрозу

Асеньняя пасеўная кампанія па Стара-Дарoскім раёне знаходзіцца **пад пагрозай зрыву**. Згодна пляну да 1 кастрычніка трэ' было засеяць рознымі культурамі 11350 га, з якіх жыта—11200 га, пшаніцай—116 га і азімай вікай—25 га. На 3 кастрычніка колгасы засеялі толькі 136 гэктараў, з якіх жытам—132 і пшаніцай 4.

Індывідуальным сэктарам засеяна 5840 га, з якіх жытам — 5820 і пшаніцай—20 га, што разам складае 54 проц. выкананьня пляну. **Азімай вікаю ні колгасамі, ні індывідуальным сэктарам, ніводнага га не засеяна.**

Загадчык зямельнай часткі Стара-Дароскага РВК тлумачыць зрыў асеньняй сяўбы тым, што вызначаная для пасеву плошча яшчэ занята бульбай, якую не пачалі выбіраць.

Комсамольскія ячэйкі стаяць у баку ад правядзеньня асеньняй сяўбы.

Міхась Вясёлы.



У Старадароскім РВК усё пішуць цыркуляры, а сяўба зрываецца

Растуць новыя колгасы

ЗАСЛАЎЕ, 6. (Ад нашага юнкора). Асеньняя пасеўная кампанія па колгасах Заслаўскага раёну прашла пасьпяхова. Большасьць колгасаў засеялі свае палі ачышчаным насеньнем. Колгас „Полымя" і Дзяржынскага закончылі сяўбу на тры дні раней вызначанага тэрміну. З посьпехам заканчваюць сяўбу і саўгасы.

Саўгас „Саламарэчча" сяўбу закончыў 19 верасьня, плошча пад азімы клін пашырана на 7 проц.

Азімы клін па колгасах таксама пашыраны да 8 проц.

Ударная праца колгасьнікаў і саўгасьнікаў прыцягвае да сябе ўвагу адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У шмат якія колгасы пачаўся прыліў, організоўваюцца новыя колгасы. У Гатовінскім сельсавеце організаваўся новы колгас—„Зара соцыялізму", куды ўступіла 28 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У Сёмкава-Гарадзецкім сельсавеце з вёскі Сялюты запісалася ў колгас 7 бядняцкіх гаспадарак, з вёскі Сёмкава—8 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. У колгас „Полымя" Рагачоўскага сельсавету за апошнія дні ўступіла 9 гаспадарак, у колгас імя Сталіна, Траскоўскага сельсавету, кожны дзень паступаюць дзесяткі заяў аб прыёме ў колгасы.

Колгасы змагаюцца за прыліў шляхам організацыі справаздачных сходаў па вёсках і вечароў дружбы колгасьнікаў з аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі (колгас „Чырвоны Прамень").

Усе раённыя організацыі праводзяць вялікую працу па замацаваньню старых колгасаў, утварэньню новых і організацыі новага прыліву.

А. Верас.

Калі-ж адгукнецеся на выклік

Стара-Барысаўскі с.-г. тэхнікум ужо ў другі раз выклікае на соцыялістычнае спаборніцтва Марына Горскі сельска-гаспадарчы тэхнікум па пытаньнях дапамогі саўгасам і колгасам ва ўборцы і асеньняй сяўбе. Але апошні яшчэ да гэтага часу не адгукнуўся, між тым, як комсамольская ячэйка, так і наогул студэнцтва, мала чаго зрабілі для асеньняй сяўбы.

Валодзя.

Комсамольцы зрываюць працу колгасу

Уборка ўраджаю ў колгасе „Чырвоны Кастрычнік", Тураўскага раёну праходзіць вельмі дрэнна. Колгас ня ўбраў 18 га сенажаці. Ня прыступілі да ўборкі бульбы. Не засеяна ніводнага кілё жыта і пшаніцы.

Працоўная дысцыпліна сярод колгасьнікаў зусім слабая. Паасобныя комсамольцы, як Лазарчук і Каваленка, падрываюць працу ў колгасе, ня ідуць на тыя работы, куды іх пасылаюць. Ніякай працы па ўцягненьню новых колаў бядняцка-серадняцкіх мас у колгас не праводзіцца.

Комсамольская ячэйка не стаіць на чале колгасу.

М.

„Новы Шлях" скончыў сяўбу

Колгас „Новы Шлях", Рудзенскага сельсавету, пасьпяхова закончыў асеньнюю сяўбу. Засеяна 57 га жыта і 5 га пшаніцы. Організаваная ў час сяўбы жаночая брыгада абвясьціла сябе ўдарнай.

Р.

80 ударных брыгад імя 3-га году пяцігодкі

У дзень ударніка па Барысаўшчыне адбыліся зь[езды] ўдарнікаў

Па фабрыках і заводах Барысаўшчыны адбыліся з[езды] ўдарнікаў. На фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна" 55 удар[нікаў] уступіла ў комсамол. Самазабавязацельствам ахоплена ... чалавек, організавана 80 ударных брыгад імя 3-га году [пяці]годкі, якія ахопліваюць 1400 рабочых. Сустрэчны прамфі[нплян] павялічвае выпуск продукцыі на 4,1 проц. На зьлёце ў[дарні]каў прэміравана 193 чалавекі, з якіх 60 проц. комсамо[льцаў].

На лепшай з Барысаўскіх фабрык па выкананьню фінпляну папяровай фабрыцы „Профінтэрн" сустрэчны фінплян павялічвае выпуск продукцыі на 3,8 проц.

На гэтай фабрыцы прэміравана 20 чалавек.

Г. КУГЕЛЬ.

Адказны рэдактар—Рэдкол[эгія]

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел №